Цана асобнага нумару 20 гр. Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 46 (545). Вільня, Панядзелак 25 Сьнежня 1933 г. Год IX (XVII)

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: ВІЛЬНЯ, Завальная вул. 1-1. (Wilno, ul. Zawalna 1-1). Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел. КРЫНІЦА“ каштуе на год—4 зл. на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй. ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

Вітаем!

На 24.XII.1933 г.

Нядаўныя юбілейныя падзеі ў Славацкай Нітры, выявілі йшчэ раз прад цэлым сьветам нябывалую сілу народнага корыфэязмагара Славакоў—Ксяндза Андрэя Глінкі, які магічным словам, бы' чарадзей валадарны, кіруе і ўспакайвае расшалелыя сілы, стаячыя на беразе крывавага адчаю...

З прагавітасьцю ўява наша сачыла ды падзіўляла зьлітую ў сталь народную душу Славаччыны і яе вялікага Павадыра, трымаючага ў магутных руках сілу і долю Народу.

Які-ж шчасьлівы Славацкі народ, што мае такога Павадыра!

Які-ж разумны Славацкі народ, што ўмее слухаць свайго Галавы ды салідарна лучыцца ля яго!

Для такога народу ня страшны і найвастрэйшы зуб воўчага шовінізму.

*

У сто раз цяжэйшая доля нашага Беларускага Народу дамагаецца ў сто раз магутнейшага ідэйнага павадыра - барацьбіта, трымаючага ў валадарных руках сваіх усе ніці-нэрвы народнага адраджэньня.

Калі незалежным нацыям у іх дасягненьнях патрэбны сяньня Муссолінія, Гітлеры, дык нам, пазбаўленым незалежнасьці, у сто раз патрабнейшыя — Глінкі.

*

А дзе-ж Твой, бедны, здрадай і нязгодай разьдзёрты Народзе Беларускі, — дзе твой Глінка?

Ці ўжо, і калі, і гдзе радзіўся, узгадаваўся ды дасьпеў Ён?

Ці выявіў незапярэчныя здольнасьці, ідэйныя кваліфікацыі?

Ці хваля ўсенароднага адраджэньня вынесла Яго панад ровень масавых адраджэнскіх сіл?

Дзе Ты доўгажданы, слаўны, верны, стойкі, магутны Павадыр — наш Глінка?!...

*

Браты, каму Бацькаўшчына дарагая, скіньма чорныя акуляры ўсякіх розьняў ды партыйных упярэджаньняў і зрабем сваім уласным бесстаронным вокам уважны перагляд сучасных жывых перадавых адраджэнскіх сіл. Пазнайма — параўнайма — ацанема...

Толькі сьмяротна акалечанае вока не дасьледзіць вырасшага сярод нас, скромнага, ідэйнага сфінкса. Ідэя нам Яго зрадзіла тут, над Вяльлёй, у тых ведамых віленскіх сэмінарыйных мурох сьв. Юрага. Працавітая з натуры і ўталентаваная душа Яго, ўзмацаваная здаровай акадэмічкай хрысьціянскай адукацый там, над шырокай Нявою, — ідэйнае ўзгадаваньне сваё належна паглыбляе. А рэволюцыйны агонь ды бурлівая хваля даўгалетняй культурнай і палітычна-адраджэнскай дзейнасьці ў Расеі і Польшчы — ўзгадаваньне тое і прыспасабленьне давяршае, адкрываючы ў Ім нязвычайную энэргію і здольнасьці.

Ідэйнай адраджэнска незалежніцкай лініі, паміма шалёных подступаў і пагроз, не зламаў. Там, дзе другія дзеячы, ня могучы апанаваць сытуацыі, тварылі фатальныя абмылкі, адпадалі, апускаючы ад зьнямогі рукі, — Ён прыходзіў і штурмам свайго пераконываючага энтузіязму заваёўваў адна за другою загрожаныя ворагам пляцоўкі. А ўсюды, дзе толькі Ён зьявіўся, расла ў народзе сіла, вера і надзея ў перамогу, расьлі кадры ідэйных змагароў. Справа, якую толькі дзьвігнула Яго сталёвая далонь — трывае-крапчэе-расьце.

Колькі не паўставала тут змоваў, арганізацыяў, установаў і паасобных людзей, што з уласнай блізарукасьці ці чужацкай злосьці хацелі-б зьнішчыць вызначаную і адстаяную Ім незалежніцкую лінію! Колькі ні сыпалася супроць Яго ўсякіх наказаў і забаронаў — арцыбіскупская забарона належаць да Б.Х.Д. — ! Колькі ні вылівалася на Яго дзікой і ашалелай злосьці, колькі не тварылася здрадных падкопаў з боку міжнародных спэкулянтаў, ня могучых адстаяць прад Ім сваей лініі ў адкрытым полі? — І дзе ўсё гэта?.. Усё разьвеяна жыцьцём! А Ён, узмоцнены перамогамі над праціўнікамі стаіць, бы' той сфінкс валадарны між бураў і пяскоў сыпучых!..

*

Ксёндз **Адам Станкевіч**, або, як любяць зваць Яго популярна — „Адамка“, — каму-ж з беларусоў ня знанае гэта імя?! Колькі сымпатыі, жыцьця, радасьці, сілы, веры і надзеі крые ў сабе яно?!

Атлет фізычны і псыхічны. Нязвычайна консэквэнтны, вытрывалы і рэгулярны ў жыцьці і працы. Сымпатычны і шчыры ў адносінах, хоць далёкі ад усякіх сэнтымэнтаў і цяжкі рэаліст у поглядах і мэтодах дзейнасьці. На пагодным твары Ягоным і ў сьмелым бадзёрым воку трудна дасьледзіць трусьлівай безнадзейнасьці, зьняверы і зьнеахвочаньня. Гэта чалавек, які ня ўмее хістацца, сумаваць, баяцца і адступаць.

Хто-ж з нас ня меў супольных ідэйных спраў у такой ці іншай галіне адраджэнскай працы і не праканаўся аб гэных дадатніх прыкметах Ягонага характару?! Хто не паступаў высокага... парогу слаўнай многалетняй Ягонай „рэзыдэнцыі“, прытуленай на прыстрэшку, бы' гняздо вераб'інае, ля братняй сядзібы гасьцінных Літоўцаў у сьв. Мікалая ў Вільні?!—Адведвалі тую „рэзыдэнцыю“ ня толькі беларусы, ад найвышэйшых становішчаў да найніжэйшых, сяляне, але і заграчнічныя навуковыя, грамадзкія і палітычныя дзеячы, выносячы адтуль напэўна праканаНьне, што і **Беларусь мае свайго Галаву, свайго Глінку.**

*

Дзень двацацы чацьвёрты м-ца сьнежня, сьвяты для ўсіх дзень Куцьці, ёсьць днём ня толькі Твайго, Дастойны наш Імяніньнік, Патрона, але і — нашым. То-ж калі засядзеш за сталом традыцыйным сьвяткаваці падвойнае сьвята—сьвята Каляд Хрыстовых і сваіх Імянін, калі разам з Табою ў уяве Тваей ідэйнай засядзе і гаротная Маці Беларусь, успомні — просімо—аб тэй сваей „сакалінай сям'і“, якая на кліч Твой ішла, ідзе і пойдзе з Табою ў барацьбе за лепшую будучыню Бацькаўшчыны!

Дзелячыся сьвятой Калядой, дзелімся з Табой, о. Адаме, найгарачэйшымі імяніновымі пажаданьнямі, каб захаваў нам Бог Цябе ў здароўі на доўгія часы ды каб і на далей быў Ты цёмным сілам на пострах,а нам—**жывым прыкладам працавітасьці, ахвярнасьці і вытрываласьці ў службе Бацькаўшчыне.**

МНОГІЯ, МНОГІЯ ЛЕТЫ!!!...

ІНЖ. АД. КЛІМОВІЧ.
Старшыня Б.Х.Д.

Усіх падпішчыкаў, чытачоў, і прыхільнікаў шчыра вітаем з КАЛЯДНЫМІ СЬВЯТКАМІ і НОВЫМ ГОДАМ!

Рэдакцыя і Адміністрацыя „БЕЛ. КРЫНІЦЫ“.

Нічога новага пад сонцам.

(*Да савецкай палітыкі апошніх часоў*).

Хто хоць крыху сьлядзіць за савецкай палітыкай апошнім часам, той ня можа не заўважыць сапраўдных дзіваў гэтай палітыкі. Саветы ў сваей найнавейшай палітыцы, як загранічнай, так і ўнутранай, робяць такія выкрунтасы, зразуменьня якіх і апраўданьня дарэмна мы шукалі-б і ў іх тэорыі і, у некаторай меры, у даўнейшай іх практыцы. Тое, што даўней Саветы ўважалі за догму сваей палітыкі, цяпер зьмяняюць радыкальна, а ўзноў тое, што лічылі нягодным сваей увагі, цяпер уважаюць за нешта важнае і паважна з тым лічацца. Агулам трэба сказаць, што савецкая палітыка апошнім часам значна заламалася і, адхіляючыся ад догмы камунізму, павяла ССРР у бок старых, даўно ўсім ведамых, шляхоў. Лацінская пагаворка: няма нічога новага пад сонцам, у вялікай меры на Саветах спраўджаецца. Сэнжа гэтай пагаворкі ў тым, што жыцьцё з сваімі правамі, так як і Аўтор яго, вечнае, а тое ўсё, што з яго ў разьвіцьці чалавецтва вырастае, хоць зьяўляецца нечым новым, але адначасна ёсьць яно нечым і старым, бо з асновай жыцьця, з якой паўстае, шмат у чым далей становіць цэласьць. Права гэта асабліва ярка кідаецца нам у вочы ў галіне вечных ідэалаў: як напр. рэлігіі, этыкі, праўды, грамадзкай і міжнароднай справядлівасьці і інш. Бальшавікі ў сваіх пачынаньнях хацелі задзівіць сьвет і ў сваей палітыцы паступалі так, як-бы нішто і нігдзе іх да нічога не абавязвала, як-бы яны адны былі на сьвеце, як-бы былі абсалютна незалежнымі ні ў чым і ад нікога і як-бы былі — ня то што тварцамі свайго ўласнага жыцьця, — але быццам багамі, бо аўторамі жыцьця нагул. Тымчасам жыцьцё іх павучае, што гэткай дарогай далёка ня зайдзеш і бальшавікі пачалі шмат ад чаго адступленьне.

Бліжэйшымі прычынамі, якія змушаюць бальшавікоў шмат у чым крывіць сваю камуністычную лінію, зьяўляюцца: разгром камуністаў у Нямеччыне і далейшыя гітлераў-

скія пляны на ўсходзе Эўропы, далей — магчымасьць нападу на Сібір з боку Японцаў, урэшце дэзорганізацыя эканамічнага жыцьця ў СССР і голад.

Вось-жа гэныя прычыны прынцыповыя — безагляднае ламаньне правоў жыцьця, — аб чым мы ўспомнілі, а так-жа прычыны гэтыя, часткова вынікаючыя з гэных, і змушаюць бальшавікоў адступаць ад сваей лініі, даходзіць да сьмешнасьці і блутацца ў супярэчнасьцях.

Бальшавікі бывала так прабіралі заходне-эўропэйскую дэмократыю і буржуазію, што чуць-чуць ня ўжывалі расейскіх „трох этажных“ слаўцоў, так даймалі іх, што аж сьвет тросься. Тымчасам цяпер Саветы з тэй-жа дэмократыяй і буржуазіяй банкетуюць, цалуюцца і падпісваюць рознага роду дагаворы: аб узаемным добрым сужыцьці, аб ненападаньні, аб супрацоўніцтве. Аб сваім найбольшым заданьні і лятуценьні—аб клясавай рэвалюцыі ў Эўропе,—забыліся дарэшты.

Рэлігія — дурман для народу — цьвердзяць бальшавікі і поўнае яе зьнішчэньне — гэта так-жа адно з найгалаўнейшых заданьняў Саветаў. Тымчасам Літвінов, падпісваючы нядаўна дагавор дружбы з Амэрыкай, на дамаганьне гэтай апошняй, падпісаў згоду даць поўную свабоду рэлігіі для амэрыканскіх грамадзян прабываючых у СССР.

Зьнішчэньне зямельнай і ўсякай іншай уласнасьці — гэта так-жа бальшавіцкая догма, якую яны правялі з вялікім трэскам і глумам і праз што давялі, прадусім сялянства, да поўнай руіны і да голаду. Тымчасам цяпер, каб процiўставіцца Японіі, бальшавікі пастанавілі паслаць у Сібір, на Далёкі Усход, перасяленцаў і надзяліць іх там зямлёй на ўласнасьць.

Гаварылі некалі бальшавікі і аб свабодзе народаў, тымчасам адносна беларусоў і украінцаў павялі яны апошнім часам палітыку, якой пазайздросьцілі б ім і даўнейшыя цары. З гэткай да народаў савецкай палітыкі пэўне ж цешыцца Гітлер, які з нагоды яе — пад плашчом вызваленьня, а сапраўды для нямецкіх плянаў колёнізацыі і эксплёатацыі — пагаварвае аб арганізаваньні Украіны і Беларусі.

Словам, старую запялі бальшавікі песьню і на стары лад. Гэта ўсё яшчэ раз, лішні раз, вуча беларускі народ, апёршыся на адвечныя Божыя і прыродныя правы, арыентавацца прадусім на свае ўласныя сілы ў сабе самым шукаць шляхоў вызваленьня адраджэньня.

М. Б.

Аб выбарах у Самаўрады.

(Выбары ў Гмінныя Рады).

Прайшлі ўжо выбары ў Грамадзкія Рады, а спосаб іх гулкім рэхам разлягаецца па нашых сёлах. Пісалі людзі пратэсты і жалабы да ўладаў, пісалі аб гэтых падзеях і ў газэту. Але ўсюды ціха і мярцьвечая глушы. Так, глуш, цішыня, але гэта толькі так здаецца і некаму гэтак хочацца. Аднак жыцьцё бурліць, бо народ ня сьпіць і дамагаецца свайго.

Выбары ў грамадзкія Рады — гэта-ж не вялікі факт у жыцьці. А які вялікі ўзьдзьвіг у народзе. Колькі пажаданьняў лепшага, колькі нараканьняў, колькі пратэстаў і колькі ўсялякіх жалаб.

Прадамною, пішучым гэтыя радкі на рэдакцыйным стале, дзесяткі карэспандэнцыяў з розных куткоў нашай староնкі, апісваючых прошлыя выбары ў грамадзкія Рады. Разглядаю гэтыя пісьмы: Баранавіцкі, Ашмянскі, Браслаўскі, Пастаўскі, Нясьвіскі, Наваградзкі, Слонімскі, Ваўкавыскі і інш. пав., а зьмест амаль адзін: выбары адбыліся без галасаваньня, або ўсе сьпіскі былі ўняважнены, а толькі астаўся адзін і г. д. Чытаю пісьмы з подпісамі аўтараў па аднаму, напатыкаю і зборныя пратэсты, прысланыя ў рэдакцыю для ведама. Спатыкаю пратэсты з подпісамі на цэлым аркушу паперы. Падлічваю: — 169 подпісаў. Гэта голас 169 сялян падаўшых пратэст у Выбарчую Камісію і да начальства. Але ці пачуюць гэты голас?.. Голас народу заўсёды чутны. І кепска той робіць, хто да голасу народу не прыслухоўваецца. Дык паслухайма, што гаворыць наш, беларускі народ. Ужо кожнаму ясна, што на „Крэсах Всходніх“ жыве не этнографічная маса для пераробкі на палякоў або маскалёў, але маючы народную волю і сьведамы сваей народнай годнасьці Беларускі Народ.

—о—

Адбыліся так-жа ўжо выбары солтысаў і падсолтысаў. Многа можна было-б напісаць і аб гэтых выбарах, каб не „прасьцярога“ апісываньня выбараў у Грамадзкія Рады. Але беларускае сялянства дасканальна ўжо ацаняе факты і робіць з іх вывады і бяз помачы прэсы.

І так, выбары ў Грамадзкія Рады, выбары солтысаў і падсолтысаў у Віленскім ваяводзтве ўжо адбыліся, а цяпер ужо ад 15 гэтага м-ца пачаліся выбары ў гмінныя самаўрады — ў Гмінныя Рады.

Пэўне-ж хутка пачнуцца выбары ў Гмінныя Рады і ў другіх ваяводзтвах нашага Краю: Наваградзкім, Палескім і Беластоцкім, калі не пачаліся ўжо.

Не зважаючы на спосабы праводжаньня гэтых выбараў і тых варункаў, у якіх яны адбываюцца, беларускае сялянства павінна імі цікавіцца і належна да выбараў аднесьціся.

Трэба ведаць, што ў Гмінныя Рады можна выбіраць людзей і не прайшоўшых у грамадзкія Рады. Дзеля гэтага, трэба дараджаць раднікам Грамадзкіх Радаў, якія будуць выбіраць Гмінныя Рады, каб яны не абміналі добрых, стойкіх і сьведамых людзей у выбарах, абмінутых з тых ці іншых прычын у выбарах у Грамадзкія Рады, а выбіралі іх проста ў Гмінныя Рады.

п—к.

Месяц сьнежань ёсьць «Месяцам Беларускай Коопэрацыі.» — Усьведамляйцеся ў коопэрацыі! Чытайце „САМАПОМАЧ“! (Вільня, Полацкая 4-10).

Прычыны анархіі ў Царкве!

Трэба думаць, што Выш. Дух. Ўлады хацелі-б бачыць жыцьцё Царквы магутным, абапёртым на здаровых творчых падставах яе паступовага разьвіцьця. Не жадае і беларускае праваслаўнае грамадзянства, каб Царква паслаблялася ці то шляхом нутранае анархіі, ці іншымі прычынамі. Наадварот, нашае праваслаўнае грамадзянства ўсьцяж працуе над тым, каб на кроўным саюзе духавенства з народам наша Царква якнайслаўней закрасавала. З гэтага відаць, што паміж намаганьнем Выш. Дух. Уладаў і нашым не павінна быць непаразуменьняў. На вялікі жаль гэныя непаразуменьні, дагэтуль прынамсі, былі даволі вялікія. Ня будзем уваходзіць у прычыны гэтага, пастараемся лепш знайсьці шляхі, каторыя на будучыню выключылі-б ўспомненыя непаразуменьні. Шляхі гэткія мы можам і мусім знайсьці, бо йнакш з нашага непаразуменьня будуць карыстацца, што ўжо робіцца і цяпер, дзейнікі Царкве далёкія. Бязумоўна, першым варункам гэткага супрацоўніцтва павінна быць нашая паслушнасьць у царкоўнай працы гіерархаў. Мы гэта ведаем, ад гэтага мы ніколі і ня ўхіляліся. Аднак і з боку гіерархаў павінны наступіць шчырыя да нас адносіны — падыход роднага бацькі да сваіх дзяцей, а не дыплёмата да дыплёматы. Сяньня, можна сказаць, гэткія новыя шляхі згоднага сужыцьця быццам ужо і зарысоўваюцца на фоне царкоўнае палітыкі, прынамсі ў ваднасінах да беларусоў.

Аднак побач з гэтым робіцца і нешта незразумелае. Сьв. Сынод, Блаж. Мітрапаліт Дзяніс, Эпархіяльныя кіраўнікі даюць і рассылаюць афіцыяльныя загады, гаворачыя аб распачацьці новых шляхоў сужыцьця—прызнаньні беларускай мовы ў царкоўным жыцьці. У гэты-ж час па розных закутках Зах. Беларусі розныя сьвяшч. Дэрынгі публічна зьневажаюць Беларускі Народ, абзываючы яго мову—„хамскай“ і „мужыцкай.“ Сапаставіўшы гэткія выступленьні сьвяшч. Дэрынгаў з афіцыяльнымі пастановамі Выш. Дух. Уладаў, прыходзіцца сказаць, што або такія сьвяшч. Дэрынгі маюць столькі адвагі і публічна насьмяхаюцца з пастановаў сваіх Уладаў, або што гэтыя апошнія надужываюць шчырасьць ужо на самым пачатку творачагася сужыцьця. У гэткае надужыцьцё мы ня хочым верыць і ня верым, а таму прыходзіцца прыняць першую альтэрнатыву, г. зн. што ўспомненае выступленьне было актам самаволі сьвяшч. Дэрынга. Сваім выступленьнем успомнены сьвяшчэньнік насьмяяўся з пастановаў Дух. Уладаў, падрываючы гэтым іх аўтарытэт у народзе, зьняважыў найглыбейшыя пачуцьці сваіх пасомых і, самае галоўнае, выказаў імкненьне да справакаваньня наладжываючыхся добрых суадносін і сужыцьця праваслаўных беларусоў з сваімі архіпастырамі і пастырамі. Гэткія намаганьні сьвяшч. Дэрынга прыходзіцца зкваліфікаваць як яўную анархію, уводжаную на ўлоньне Царквы. А гэтую анархію з Царквы трэба выкараніць суровай бацькавай воляй, бяз інгерэнцыі дзейнікаў трэціх.

Сьцяпан Аўсянік

Keturakis.

Ameryka ŭ łaźni. 9)

Kamedyja ŭ troch dziejach.

Z litoŭskaj mowy pierakłaŭ

St. Marcinkiewič.

(Praciah, hl. „Bieł. Krynicu“ Nr. 45).

Fajbčyk. Tolki sa! tut usio budzie jak na dałani. Jak jana minie tak, to ja jej kazu: ci ty adurnieła, ty minie kazy, sto tut zhabiłasia: ci hety Wincuk ukraŭ ad ciabie hrosy, ci ty jamu sama addała?—A jana z płacam minie hawora: „Jon złodziej sam ad minie uziaŭ; ja tolki pahladzieć chacieła.“ Ja tady u jaje pitaju: Kudy hety hrosy biło? — U baćkawaj skryncy — ja tolki pahladzieć chacieła, a heny razbojnjk uziaŭ ich. (*Hurbuz saskakwaje z zedla i staić spałochany*).

Antoś. (*Sam sabie*) To hetyja samyja! heny lucypar ich i wykruciŭ. I jašče henych 10 zał. panios... A kab jon haławu skruciŭ!... (*skrabie haławu*).

Fajbčyk. Tady ja jej kazu: uj, ty durnaja, tabie treba było krycać, dyk jon-by kinuŭ hrosy — tuk jana kaza: „Kali-ž jon, razbojnik mianie prasiŭ nie kazać nikomu, jon mianie ŭ Ameryka chacieŭ wiaźci...“ (*Harbuz spałochany šparka wybiahaje praz dźwiery ŭ kamoru*). Uj, Jazep! Jazep! twaja piec astyhnie! Uj, jaki ciapier u jaho hozum: recht jon jaho ciapier za chwost złowić.

Swat. (*Antosiu*) Dyk hetyja hrošy, Antoś?

Antoś. Hetyja, chalera, kab jon tak prapaŭ, jak jon mnie zrabiŭ heta! ..

Harbuzicha. Matuchna Božaja, što ciapier tut u nas zrabiłasia? Tolki ŭžo Fajbčyk, hawary skarej, nie raździraj ty mnie serca.

Fajbčyk. Paśla ja jasce ŭ jaje pitaju: cahoz ty tut cakajes, kali twoj Wincuk daŭno wijechaŭ? — „Uj, kali heny bhadziaha minie zapior, skazaŭ—pačakaj tut, a ja z kaniom pryjedu i ciabie zabiahu.“ — To jana, kaza, cakała, cakała, a tut noč nadichodzie, ciomna; jaje uwziaŭ strach, jana chacieła wijści — dźwiehy nia puscajuć, jana krycać Wincuka, a jon u hetym casie ŭzo papjor uw Amiehyka.

Harbuzicha Ach hety badziaka, ci-ž jon dušy nia maje — dziaŭčynu hetak zapiorci! Ach. Jezu! kab choć chto padbieh wypuścić, tož jana—barani Boža—tam zwarjuje. Božańka! što-ž heta ŭ nas siahońnia stałasia i ŭ haławu trudnaŭziać!

Fajbčyk. Sto thudna ŭziać; kali tut usio jak na dałani.

Harbuzicha. Adkul jany hetyja hrošy dastali? Moj Jazep zdajecca hetulki nia mieŭ?

Fajbčyk. Uj, jak jon nia mieŭ. kali jamu hety dobhy dziaciuk (*pakazwaje na Antosia*) biŭ daŭsy, to camu jon nia budzie mieć? Uj, hety Wincuk: heta haława! heta hozum. Uj, kab jamu biezhałoŭje, jak jon wam zhabiŭ, ciapier u jaho kisani dźwieście dalahaŭ, jedzie uw Amiehyka i śmiajecca. Uj, heta haława!

Harbuzicha. Wot prachwost, prajdziświet; chto, zdajecca, hetaha spadziawaŭsia!...

Swat. Aha! .

Fajbčyk. A jak Agata kazała, jak hety Wincuk ab hetym dziaciuku hawahyŭ: sto jon zły jak cort, skupy, mały, kasawoki, harbatyj,— i kazaŭ, kab jana uciakła ad jaho.

Antoś. Wot niačyścik praklaty, a ŭ wočy jak padlizywaŭsia.

Harbuzicha. Wot wyradak, wot lucypar— dziaŭčynu hetak ašukać! Chiba-ž jon umirać nia źbirajecca!

Harbuz (*ubiahaje spałochany*) Ach, zładziuha — abhledziŭ! Ach, kab ty haławu dzie skruciŭ! Judaš praklaty! To-ž žart— jak zrabić! i siudy i tudy—ukradzieny! Kab jaho dzie mora zaliło, jak jon pajedzie! Ach, što ž ciapier rabić? (*wychodzie*).

З беларускага жыцьця.

Другія паўгодкі ў Беларускай Філіі Дзярж. Гімназіі Ю. Славацкага ў Вільні. Цяжкі лёс Беларускага народу, цяжкі лёс і яго прасьветы. Былі прыватныя беларускія гімназіі — было цяжка іх утрымаць, але доступ да навукі ў іх быў лягчэйшы. Некаторыя з пасярод беларусоў „прысвоіўшы" польскую орыентацыю цьвердзілі, што лёс гімназіі паправіцца толькі „упаньствовеньнем" і на гэты шлях пакіравалі беларускую школу і гімназіі ў Вільні і Навагрудку „упаньствовілі.", Кіраўнічыя ролі ў гэтай справе былі ў руках А. Луцкевіча, Р. Астроўскага і кумпаніі. Пачалася новая эра; вучыцельскі пэрсонал на чале з дыр. Астроўскім забясьпечаны, гаспадарчая галіна гімназіі так-жа забясьпечаны і А. Луцкевіч на санацыйным панадворку, на якім апынулася і гімназія. Асталіся незабясьпечанымі толькі вучні, бо навука ў гімназіі сталася для многіх беларускіх вучняў недаступнай, аплата ў малодшых ужо клясах па казённай цане паднялася ўдвая даражэй, а то і больш. У выніку гэтага з кожным годам лік вучняў у гэтых казённа-беларускіх гімназіях зьмяншаецца, а кожнае школьнае паўгодзьдзе для многіх вучняў, іх бацькоў або апякуноў — гэта проста трагэдыя; дырэктар гімназіі выдаляе вучняў з школы, бо бацькі не маглі ў пару заплаціць за навуку, або не здалелі заплаціць усяе сумы ў абазначаным тэрміне. А гэткіх няшчасных вучняў у адной віленскай беларускай філіі ёсьць сёлета каля 40; ня менш хіба гэткіх нешчасьліўцаў і ў філіі навагрудзкай.

Сумнае гэта зьявішча само па сабе, але сумнае йшчэ і дзеля таго, што бяздушна спэкулююць на ім далей ты-ж дзяльцы, што гімназію ў сяньняшні тупік прывялі. Яны сяньня перапужаліся скуткаў сваіх чынаў і хаваючы галовы ў пясок, як штрусы, уцякаюць ад адказнасьці, шукаючы „вінавайцаў." Ды ня тутто было: кожны ведае, што грабаром беларускага школьніцтва ў Зах. Беларусі зьяўляюцца санацыйныя дзеячы, з дырэктарам Астроўскім і бел.-паляком А. Луцкевічам на чале. Дык іхная гэта „заслуга" і яны хай не адмаўляюцца адказваць за свае чыны і перад сучаснасьцю і прад гісторыяй.

З выдавецкае нівы. Вышлі з друку за м-ц сьнежань: „*Шлях Моладзі*" (часопісь беларускай моладзі), „*Chryścijanskaja Dumka*" (месячнік для беларусаў-каталікоў), „*Летапіс*" — Т-ва Бел. Школы (№ 5–6), „*Самапомач*" (коопэратыўна-гаспадарчы месячны журнал).

„*Беларускі Народна-Гаспадарскі Календар на 1934 г.*" Календар гэты (кніжка) быў сканфіскаваны і вернены бяз 71 і 72 бачыны; каштуе 60 гр. — Дастаць усё можна праз Беларускую Кнігарню „Пагоня" — Завальная 1—1.

Набажэнствы для віленскіх беларусоў-каталікоў з прычыны калядніх вакацыяў перапыняюцца ад нядзелі 24 сьнежня. Пачнуцца набажэнствы нанова па Новым годзе 21 студня ў тым-жа касьцеле сьв. Мікалая а гадз. 10-ай рана.

„Беларуская Крыніца" ў наступным годзе будзе выходзіць у пабольшаным фармаце. Першы нумар выйдзе з датай 7 студня.

З студэнскага жыцьця. У нядзелю 10 сьнежня с. г. адбыўся гадавы агульны сход сяброў Таварыства Прыяцеляў Беларусаведы пры Віленскім Унівэрсытэце. Сябрамі Ураду на бягучы акадэміцкі год выбраны грам. грам: Мацьвеева Тацьцяна, Мілючанка Марыся, Ільяшэвіч Хведар, Будзька Чэслаў і Сарока Сяргей.

Таварыства гэнае разьвіла за апошні час даволі шырокую дзейнасьць. Яго працы ськіваваны ў двух кірунках — зьбіраньне навуковага матэрыялу, адносячагася да жыцьця і творчасьці беларускага народу, і інфармаваньне грамадзянства аб зробленых дасьледах шляхам чытаньня рэфэратаў.

Таварыства Беларусаведы налічвае сяньня блізу сорак сяброў.

Не легалізуюць гуртка Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры. У в. Вялікая Быхаўшчына, Нясьвіскага пав. паўстаў гурток БІГіК. Трэба-ж яго легалізаваць. Паслалі ў Старастыва ў Нясьвіж — адмовілі прыняць да ведама: значыцца гурток БІГіК не залегалізавалі. Паслалі рэкурс у Наваградзкае ваяводзтвае, але і там сказалі тоесамае (L.B.P.5114/33 з 30.XI. с. г.).

З БЕЛАРУСІ ПАД САВЕТАМІ.

Бальшавікі аб беларусох і аб самых сабе. У зьвязку з надзвычайным зьездам Кам. Партыі Беларусі ў справе барацьбы з „нацдэмаўшчынай", маскоўская «Правда» перадае доўгую рэзалюцыю гэтага зьезду. У рэзалюцыі між іншым сказана:

„Вялікадзяржаўны расейскі шовінізм зьяўляецца і на далей галоўнай небясьпекай. Але гэта не пярэча таму, што ў нацыянальным пытаньні на Беларусі галоўную небясьпеку прадстаўляе мясцовы беларускі нацыяналізм... Ён падтрымліваецца ўсей контррэвалюцыяй, у тэй ліччы і троцкістамі, лучыцца з вялікадзяржаўным шовінізмам і вядзе барацьбу за адарваньне Беларусі ад СССР, за зваленьне савецкай улады, за аднаўленьне капіталізму і ператварэньне Савецкай Беларусі ў коленію заходніх імпэрыялістаў-фашыстаў".

Ад сябе „Правда" рахуе за зло беларусом, што яны лучацца з „украінскім нацыяналізмам" і далей называе загінулага ў бальшавіцкай турме праф. Ігнатоўскага „лідэрам беларускага контррэвалюцыйнага нацыянал-дэмократызму" і „правакатарам".

З тэй-жа „Правды" даведваемся, што ў Случчыне месяц таму назад была раскрыта „контррэвалюцыйная (чытай — беларуская!) нацыяналістычная група", кіраўніком якой аказаўся быццам загадчык культурна-прапагандага аддзелу раённага камітэту компартыі Іваніцкі. „Чыстка" партыйнай арганізацыі Гарэцкага раёну і там „раскрыла беларускіх нацыяналістаў".

Усё гэта не дае спаць маскоўскім валацугам на беларускай зямлі, тымбольш, што „нават" і студэнты менскіх вышэйшых школ яшчэ 3-га сьнежня с. г., у дэбаце над нацыянальным пытаньнем, выразна заявілі, што галоўнай небясьпекай ёсьць усё-ж тойсамы маскоўскі вялікадзяржаўны шовінізм.

Словам, як ні намагаюцца бальшавікі змазаць беларусоў з твару зямлі, усё ж яны жывуць, разьвіваюцца і не даюць спаць бальшавіком ня толькі тут, у Зах. Беларусі, але і там, пад носам бальшавіцкіх камісараў.

Расьцём і расьці будзем!

БЕЛАРУСЫ Ў ЛАТВІІ.

Дзесятыя ўгодкі беларускае школы у Рызе. 30 г. м. беларускае грамадзянства ў Рызе ладзіць урачысты акт 10-х угодкаў 1-ай у Рызе меставай асноўнай школы.

З нагоды гэтай урачыстасьці вітаем працаўнікоў на ніве беларускай школы ў Латвіі і выражаем пажаданьне разросту карысных для народу пладоў гэтай працы.

З ГАЗЭТ.

Гэтак не прастуецца.

Летапіс Т-ва Б. Ш. (№ 5–6), паклікаючыся на нашу „малую рэцэнзыю Летапісу," кідае каменькы ў наш гарод, прыпісваючы нам „супрацоўніцтва" з „рэакцыйнымі коламі польскага грамадзянства." А ўсё гэта выводзіць з таго, што мы быццам гаворым аб „надпрадукцыі беларускай інтэлігенцыі..."

Рабіць гэткія выснаўкі з нашай стацьці „Прад новым школьным годам" („Бел. Крыніца" № 27) і прыпісваць нам тое, чаго мы **не** казалі, гэта хіба-ж не належыць ані да добрага тону ані спрычыняецца да „спрасаваньня лініі." Бо адна рэч „надпрадукцыя інтэлігенцыі," а другая сусім рэч — **недахоп інтэлігентных прадуцэнтаў**, лік якіх уважаем за патрэбнае павялічыць коштам інтэлігенцыі безфаховай

Гэта адно. А другое—і гэта важнейшае, —што лінія Т.Б.Ш., так моцна пакрыўленая на леташнім беластоцкім зьезьдзе, і далей астаецца нявыпраставанай.

Дык ці ня лепш зрабіў-бы „Летапіс," каб замест „праставаць" лінію „Бел. Крыніцы," адважыўся праставаць лінію сваю уласную? Думаем, што так, бо-ж „Летапіс" да гэтага пакліканы ў першую чаргу! Дачакаемся?

b.

З Польшчы.

Праект новай конституцыі. Адразу пасьля траўневага пераваротy ў 1926 годзе сталася патрэбнай зьмена дзяржаўнай конституцыі ў Польшчы. Яшчэ ў тым-жа 1926 годзе былі малыя зьмены конституцыі, якія ўсілілі ўладу Прэзыдэнта. Каб зьмяніць конституцыю, трэба дзьве трэціх галасоў Сойму, а дзеля таго што ахвотнікі зьмяніць конституцыю гэтулькі галасоў у папярэдніх Соймах сабраць не маглі, дык аб зьмене конституцыі толькі думалі і пісалі праекты. У гэтым Сойме самі толькі Бэ-Бэкі так-жа не становяць дзьвюх трацінаў Сойму, але спадзяюцца нагаварыць

Harbuzicha. Čuješ, Jazep, choć-by z ludźmi pahawaryŭ; (*da swata i Antosia*) kali łaska, prysiadźcie; (*Agatka chutka prydzie*. Prysiadźcie i ja za časinku prybiahu... (*wychodzie*).

Swat. Hm, Agatka zrabiła hadka Dyk što, bratka Antoś, dziaŭčynu twaju ŭkrali, to nam niama čaho balej čakać i na Harbuza napadać nia wypadaje, kali-ž i jaho, brat, jašče horš ašukali, žartački! A ci raśpisku jon tabie daŭ?

Antoś. Raśpisku to wydaŭ, tolki pracenty zamałyja. Što jon mnie—swat ci brat! Pawinien jon mnie pierapisać.

Swat. E, hdzie jon ciapier tabie pierapiša!

Antoś. Dy licha jaho biary, užo ja ad jaho ničoha nie chaču, tolki niachaj pazyčanyja hrošy addaść.

Fajbčyk. Caławiek! bojsia ty Boh! adkul jon woźmie tabie addać: ty jamu zahes — złot u jaho nia znajdzies

Swat. E, Antoś! što ty z im tut budzieš pačynać!

Antoś. E! Čort mianie z im źwiazaŭ: ad Pirejki ŭziaŭ by pa dziesiać pracentaŭ. (*Swat i Antoś biaruć šapki*).

Harbuzicha. Hościki daraženkija, čaho-ž wam tak śpiašacca, kali łaska — prysiadźcie!

Agatka chutka prydzie.

Swat. To što-ž z hetaha? Sami widzicie... čaho my tut majem astawacca...

Harbuzicha. Što-ž paradziš, kali ŭžo ŭ nas tak zrabiłasia; dziaŭčyna-ž maładaja—niama dziwa. Ach, kab chto padbieh...Hdzie-ž hety chłapiec? Fajbčyk, treba-ž było tabie jaje wypuścić...

Fajbčyk. Uj, ja ŭzo wipuściŭ, camu ja jaje nia wipuscu. Ja jej skazaŭ: Agata, u hetaj Amiehyka nia wielmi dobha—jedź damoŭ. A jana i słuchać nia choca; ulezła ŭ kut i pacała hałasić. Niu, sto ja z jej budu habić? hałasi sabie skolki chocas, ja sabie i pasoŭ. Idu sabie da Harbuz i spatkaŭ Haŭryłu stahastu, ja i jamu heta wiskazaŭ...,

Harbuzicha. To-ž treba było tabie, Fajbčyk, — ciapier toj na ŭsio siało razniasie—ja ŭžo jaho znaju! ..

Fajbčyk. Nu, tak sto ja z jej mieŭ habić? Skazaŭ: ty, bhatka Hawrył, idzi i iz hetaj Amiehyka wihani jaje da baćkoŭ, kab jana caho sabie nie zhabiła. Ale jon u swoj bok pasoŭ, a ja u swoj bok pasoŭ.

Harbuzicha. Hościki, kali łaska, siadźcie... ja tolki wybiahu pahladzieć (*choča iści, u dźwiarach spatykaje Harbuza i zatrymoŭwajecca. Harbuz niasie mašynu da šyćcia i ŭniosšy sa złościej raźbiwaje; kidaje jaje ab padłohu i, jak ašaleły, topčyć nahami*).

Fajbčyk. Uj, Jazep! nasto ty jaje papsuŭ? Uj waj! Ty duhań! Ty jaje phadać moh.

Harbuz. (*razharačyŭsysia*) Kab mnie pierad wačami ničoha jaho nia było! usio pałamlu, z ziamloj zmiašaju! Jon mianie zhubiŭ!

Harbuzicha. (*mužu*) Choć-by z ludźmi pahawaryŭ... Što ž budzieš rabić...

Fajbčyk. (*hladzić praz wakno*) Uj, Jazep, Jazep! idzi spatkaj, hość pryjechaŭ—kamornik (*usie hladziać i Harbuz pierapałochany*). O hladzi, hladzi! Agata prysła; Haŭryła prywioŭ.

Harbuzicha. Ach, Božańka! to-ž treba było hetamu bradziahu dziaŭčynu tak napužać! Hościki, prysiadźcie..

Harbuz. (*Chwataje wiaroŭku*) Ja jaje nawuču, jak ad baćki hrošy krašci; nia treba budzie jej bolš Ameryki (*choča jšci*).

Harbuzicha (*Trymajučy muža*). Bojsia ty Boha: dziaŭčyna i tak pierapałochanaja!...

Harbuz. Na bok!!

Fajbčyk (*trymaje Harbuza*) Jazep! ci cujes: daj jej spakoj. Caho ty baišsia?—chaj jaho cort z tymi dalarami, Fajbcyk, twoj pryjaciel, jasce zywie! (*Kaniec*).

іншыя групы, каб памаглі ім прагаласаваць зьмену конституцыі. Дык вось ужо праект прыгатаваны і прачытаны ў парлямантарным клюбе Б. Б.

Гэты праект конституцыі прадусім усілее ўладу Прэзыдэнта і рэформуе парлямант—Сойм і Сэнат. Паводле гэтага праекту Сойм будзе выбірацца агульным галасаваньнем, а Сэнат будуць выбіраць толькі адзначаныя ваякі і іншыя заслужаныя перад дзяржавай людзі. Пры гэтым, Сэнат мае мець куды большае значэньне ад Сойму, а абедзьве гэтыя палаты падпарадкоўваюцца ўладзе Прэзыдэнта. Словам, апазыцыя гэткі парлямант называе „салдацкім," бо робіціме ўсё па прыказу.

З Сойму. Соймавая бюджэтная камісія разглядае дзяржаўны бюджэт і падгатаўляе яго на пленум Сойму. Дня 19 г. м. падчас разгляду бюджэту Мін. Нутр. Спраў, у Камісіі прамаўляў сам міністр Перацкі, які цьвердзіў, што бюджэт міністэрства з кожным годам зьмяншаецца. А сёлетні выглядае гэтак: 1) на паліцыю: 104.521.270 зл. 2) фонд дыспазыцыйны: 6.000.000 зл. 3) КОП 38,832.250 зл. Агулам расходы мін. нутр. спраў прадбачаны на 1934-35 год на суму 195,160.480 зл.

Безработцые. Паводле статыстычных падлічэньняў, на 9 г. м. у Польшчы налічалася 283.051 асоб безработных. У параўнаньні з мінулым тыднем, безработцые ўзрасло на 17.748 асоб. Трэба ведаць, што гэта безработныя, што зарэгістраваныя ў бюрах пасрэдніцтва працы. А колькі ёсьць безработных не зарегістраваных? Пэўне ня менш, як зарэгістраваных, бо на сёлах і правінцыяльных мястэчках гэткай рэгістрацыі не вядуць.

Страшная чыгуначная катастрофа. У Пазнані 15 г. м. здарылася страшная чыгуначная катастрофа. А гадзіне 8 раніцай наехаў пасажырскі цягнік на цягнік затрыманы перад семафорам. Некалькі пасажырскіх вагонаў разьбіта ў дробязгі. Забітых пасажыраў 8 асоб і раненых 20 асоб. Сярод забітых і раненых пераважна вучнёўская моладзь, якая ехала ў школу з падгарадзкіх ваколіц. Вінаватаць за катастрофу машыніста, які не дагледзіў наперадзе цягніка.

AKADEMIA ... BIBLIOTEKA

У Катовіцах турбуюцца аб нашым Краю.

З віленскай польскай прэсы даведваемся, што з ініцыятывы Віленскай Прамысловай Палаты паўстала ў Катовіцах спэцыяльная камісія, якая будзе турбавацца аб нашым Краю, каб „папраўіць" ў ім гаспадарчасьць. А турботы гэтай камісіі палягаюць на тым, каб падняць консумцыю-спажывецкасьць тавараў у нашым Краю. Паўстала ўжо гэткага характару і падкамісія ў Вільні.

Катовіцкая камісія і віленская падкамісія, як падае віленская польская прэса, маюць на мэце і турбуюцца толькі каб падняць консумцыю ў нашым Краю дзеля збыту тут прадукцыі польскага промыслу каранной Польшчы. Словам, стараюцца палепшыць у нашым Краю рынак збыту для польскага промыслу.

Дык ня любасьць да гэтага Краю і не яго жыцьцёвыя патрэбы скланілі польскія гандлёва-прамысловыя кругі да гэтай турботы, а пабуджае іх свой уласны жывотны інтэрас, каб знайсьці прадусім для сябе дабрабыт на гэтай тэрыторыі.

А колькі-ж ёсьць жыцьцёвых патрэб у нашым Краю для яго насельніцтва запушчаных да задзірванеласьці?! Апе аб гэтых патрэбах ані катовіцкім, ані віленскім камісіям не ў галаве. Аб іх толькі гавораць беларускія ды літоўскія культурна-асьветна-гаспадарчыя арганізацыі або ўспамінаюць з стогнам беларускія і літоўскія сяляне.

Дык калі-ж паўстануць камісіі і падкамісіі і дзеля падняцьця прадукцыі ў нашым Краю? **Я.**

З Вільні.

Праф. Біржышка ў Вільні. Надовячы прыбыў з Коўны ў Вільню праф. Ковенскага унівэрсытэту М. Біржышка з жонкай.

Праф. Біржышка ў сталіцы краю Вільні прабудзе праз Калядныя сьвяткі.

З заграніцы.

Сьмерць узгадавальніка чэскага сялянства — прэм'ера А. Швэглы. 12 г. м. памёр доўгалетні старшыня чэхаславацкага Ураду і заслужаны павадыр чэскага сялянства, Антон Шв**э**гла.

Больш аб нябожчыку напішам наступным разам.

Перабудова Лігі Народаў. Каб падняць аўторытэт Лігі Нацый, дыктатар Італіі Мусоліні прапануе вялікім дзяржавам зьмяніць строй Лігі Народаў. Мусоліні цьвердзіць, што Ліга Народаў зарганізавана вельмі нязручна і дзеля гэтага яна сталася няжывой установай; засядае там многа такіх людзей, якія маюць права голасу, а з справамі рашаючыміся нічога ня маюць супольнага. Прыкладам, што можа ведаць у справе якой-небудзь эўропэйскай дзяржавы дэлегат з паўдзённай Амэрыкі? Гэтак даказвае Мусоліні і між іншым хоча нядаць мандату ў Раду Лігі для Польшчы і для Малой Антанты.

Аддзяленьне Сібіру ад Расеі. Падаюць з Харбіну, што бальшавікі за ўсякую цану хочуць выклікаць вайну між Амэрыкай і Японіяй. І многія палітыкі цьвердзяць, што гэта вайна будзе і будзе адбывацца на сібірскіх палях. Палітычныя кругі дагадваюцца, што між С.С.Р.Р. і Амэрыкай ёсьць паразуменьне ў справе аддзяленьня Сібіру ад Расеі — ад Уралу на Ціхі Акіян — і ўтварэньня асобнай Сібірскай рэспублікі, якая мае мець дэмократычны лад, а так-жа сойм, выбраны на асновах „чатырахвосткі". Гэта дзяржава мае быць пад пратэктаратам Масквы толькі фармальна, а фактычна мае там уладаць амэрыканскі капітал.

Польска-нямецкія перагаворы. У Польшчы і ў Нямеччыне 15 г. м. адбыліся гандлёвыя перагаворы, якія маюць вялікае значэньне для абедзьвюх дзяржаў. Пры гэтым трэба сказаць, што не перарываюцца гутаркі і аб палітычным паразуменьні між Польшчай і Нямеччынай. Гэтыя гутаркі вельмі моцна непакояць бальшавікоў, якія, ня будучы пэўнымі ўжо ў свае рэвалюцыйныя сілы, баяцца, каб Эўропа не загадала ім пакінуць Украіну і Беларусь.

Голад і людаедзтва ў Саветах. Міжнародная Конфэрэнцыя Камітэтаў помачы галодным у С.С.Р.Р. прыняла рэзалюцыю, якая на падставе сабраных фактаў цьвердзіць, што ў Расеі, а прадусім на Украіне і на Каўказе сёлета памёрла больш мільёна людзей з голаду. Пры гэтым заўважана зьявішча людаедзтва. Рэзалюцыя выражае пагляды, што голад у С.С.Р.Р. ня звужаецца і не зьмяншаецца, а яшчэ ўсё пашыраецца. Дзеля гэтага рэзалюцыя заклікае ўвесь сьвет да ратунковай акцыі галодных у Саветах.

Камуністы спалілі Г.П.У. ў Маскве. Надовячы згарэла ў Маскве Г.П.У. Кажуць, што гэту „слаўную" бальшавіцкую інстытуцыю падпалілі самі камуністы—працаўнікі таго-ж Г.П.У. А падпалілі яны яе быццам дзеля таго, што спужаліся самі сябе, калі пачалі рабіць пераглядз сваей дзейнасьці. Згарэла многа дакумантаў і кажуць, што згарэлі ў склепох пасаджаныя палітычныя вязьні.

Манголія пад пратэктаратам Японіі. Новы мангольскі ўрад зьвярнуўся да японскага ўраду, каб Японія прыняла пратэктарат над незалежнай Манголіяй. Відаць з гэтага, што на Далёкім Усходзе Японія дзеіць ня толькі агнём і мячом, але і дыплёматычнымі ходам

Да нас пішуць.

Супроць маскоўскіх лаянак.

Порплішча, Дзісьненскага пав. Прачытаўшы ў „Бел. Крыніцы" карэспандэнцыю аб тым, як наш сьвяшчэньнік К. Дерінг на царкоўным сабраньні ў Докшыцах лаяў беларускую мову, стыдна стала і нам парафіянам за свайго настаяцеля. Сьвяшч. Дерінг вельмі мыляецца, калі ўважае наш Порплiскі прыход„русскім„, або табуном хамаў. Вось, каб ведаў сьвет і сьвяшч. Дерінг, заяўляем, што Порплiскі прыход знаходзіцца на землях этнографічнай Беларусі і складаецца з беларусаў сялян. Усе Порплiскія прыхаджане гавораць заўсёды тэй мовай, якую а. Дерінг так нялюдзка лаяў на царкоўным сабраньні ў Докшыцах. Гэтая аблаяная сьвяшч. Дерінгам беларуская мова дарагая кожнаму Порплiскаму прыхаджаніну. Сьвяшч. Дерінг, лаючы ў Докшыцах беларускую мову, гэтым лаяў завочна нас, сваіх прыхаджан. Чаму такая ненавісьць сьвятара да народу? Няма нават з боку а. Дерінга звычайнай людзкой удзячнасьці народу за хлеб і гасьціннасьць для яго маскоўскіх ботаў. Замест гэтай удзячнасьці, мы чуем грубую маскоўскую лаянку нашай беларускай мовы. Гэткае грубіянства здольны працярпець толькі цярплівы беларус. Але-ж і Вы а. Дерінг не надужывайце нашага цярпеньня. Ня думайце, а. Дерінг, што Вы і Вам падобныя затопчаць беларускую мову сваімі маскоўскімі ботамі. Не! Ведайце, што калі Вы ня будзеце гаварыць да народу ня толькі прыватна, але і ў царкоўных пропаведзях пабеларуску, дык ужо не далёка той час, калі мы Вас папросім выбрацца з нашага прыходу. Лаяць нас і насьмяхацца над намі ўжо не пазволім.

Трох прыхаджан.

Да падпішчыкаў і чытачоў „Беларускай Крыніцы."

Выдавецтва „Бел. Крыніцы", маючы паміж іншым на мэце пашыраньне сярод беларускага народу беларускага друкаванага слова, з году ў год высылае сваім падпішчыкам прэміі ў форме беларускіх кніжак.

За прыкладам мінулых гадоў, Выдавецтва „Бел. Крыніцы" празначыла для сваіх падпішчыкаў

прэмію з беларускіх кніжак да газэты і на 1934 г.

Прэмія ўстанаўляецца дваякая і залежа ад выбару самых падпішчыкаў:

1) Хто да 25 студзеня 1934 г. прышле гадавую падпісную плату за „Бел. Крыніцу" — 4 зл. і на перасылку прэміі 2 зл., разам 6 зл., той зараз-жа атрымае ў форме прэміі вялікую кнігу (776 бачын, 3 кілё вагі):

В. Ластоўскага: **ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ (КРЫЎСКАЙ) КНІГІ.**

Гэтая кніга мае вялікую вартасьць, але з прычыны гаспадарчага крызысу Выдавецтва наша дастала 50 экз. гэтай кнігі па таннай цане і ахвяроўвае іх сваім падпішчыкам.

2) Хто да 1 сакавіка 1934 году прышле гадавую падпісную плату за „Бел. Крыніцу" — 4 зл. і на перасылку прэміі 50 грашоў, разам — 4 зл. 50 гр., той зараз-жа атрымае ў форме прэміі 5 кніжак:

1) Новая Зямля і 2) Сымон музыка — *Якуба Коласа.*
3) Z Rodnaha zahonu — *Andreja Ziaziuli.*
4) Kaniok Harbuniok — *W. A.*
5) Ziemlarobskaja čytanka. — *inž. Ad. Klimoviča.*

Выпісывайце адрэсуючы на адрэс: „Bieł. Krynica", Wilno Zawalnaja 1—1.

Выд „Беларускай Крыніцы"

УВАГА: Засьцерагаемся, што ніякай зьмены і замены паказаных кніжак рабіць нікому ня будзем, а дзеля гэтага просім стасавацца сьцісла да вышэйпаданых варункаў.

Рэдактар Ян Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня. Выдавец А. Шутовіч.

241098